**Тэма: “Глядзі і памятай” (да 80-годдзя з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны).**

Форма правядзення: “Дыялог”

*1. “МЫ УЗНАЁМ”*

Сабалеўская Р.І. пазнаёміла прысутных з тэмай заняткаў і інфармацыйных блокаў:

“Перад памяццю час бяссільна”;

“Рэспубліканскі культурна-патрыятычны кінамарафон “Глядзі і памятай”, прысвечаны 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны”.

Быў прачытаны верш «22 июня ровно в 4 часа”.

*2. “МЫ РАЗВАЖАЕМ”*

Блок “Перад памяццю час бяссільна”

У час прагляду мультымедыйнай прэзентацыі паміж вучнямі і Сабалеўскай Рамуальдай Ігнацьеўнай адбыўся дыялог аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Вучні расказалі аб абароне Брэсцкай крэпасці, успомнілі імёны многіх нашых легендарных суайчыннікаў, пазнаёміліся са спісам герояў, праслухалі верш К.Сіманава “Тот самый длинный день в году”. Сабалеўская Р.І. пазнаёміла з біяграфіяй Пятра Кацельнікава, апошняга з застаўшыхся ў жывых абаронцаў Брэсцкай крэпасці, які памёр у Маскве 20 красавіка на 92 годзе жыцця.

Затым вучні праглядзелі відэафільм, у якім мясцовая жыхарка, сведка Вялікай Айчыннай вайны, Кандуховіч В. І. расказала аб трагічных падзеях вайны.

Быў прачытаны верш “За 8 гадзін да вайны” Г. Ведзянеева

Блок “Рэспубліканскі культурна-патрыятычны кінамарафон “Глядзі і памятай”, прысвечаны 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны”.

Вучні пазнаёміліся з кінамарафонам, які стартаваў ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь 1 сакавіка 2021 г. і аб’яднаў у сябе 7 тэматычных блокаў, расказалі пра фільмы, якія прагледзелі. Сабалеўская Р.І. больш падрабязна расказала аб конкурсе па выніках прагляду кінамарафона.

*3. “МЫ ДЗЕЙНІЧАЕМ”*

Сабалеўская Р.І. заклікала вучняў прыняць удзел у стварэнні сваіх кінаплакатаў (відэаролікаў), якія яны могуць распрацаваць і падрыхтаваць па выніках прагляду мастацкіх фільмаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне.


ИНФОРМАЦИЯ
ПРОЕКТ


ИНФОРМАЦИЯ

